ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
6
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 1 (1377)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
· Учора · Сёння · Заўтра ·

### КАМІТЭТ НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ

абмеркаваў вынікі дакладнасці планавання нагрузкі выкладчыкаў хімічнага і філалагічнага факультэтаў, разгледзеў работу з пісьмамі, заявамі і скаргамі, падвёў вынікі работы ў 1982 годзе і зацвердзіў план дзейнасці на першае паўгоддзе 1983 года.

**С. ПЛЫТКЕВІЧ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

### ПРЭЗІДЭНТЫ ЗЯМЛЯЦТВАЎ

замежных студэнтаў дэталёва і глыбока абмеркавалі з прадстаўнікамі рэктарата і парткома пытанні паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы сярод замежных навучэнцаў.

**А. ГРЫШКЕВІЧ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

### НА ЧАРГОВЫМ ПАСЯДЖЭННІ

бюро камітэта камсамола універсітэта разгледзела работу фізічнага і гістарычнага факультэтаў па інтэрнацыянальнаму выхаванню. Адзначана добрая работа інтэраддзела камітэта камсамола гістфака і невысокі ўзровень інтэрработы на фізічным факультэце.

Бюро камітэта камсамола заслухала таксама пытанне «Аб фарміраванні і рабоце педагагічнага атрада ў ГПТВ-53» і прыняло адпаведную пастанову.

**Т. ВАЙЦЯХОЎСКАЯ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

### ЮБІЛЕЙ

адзначае кафедра нямецкай мовы — 20 гадоў самастойнага функцыяніравання. З дня заснавання і да цяперашняга часу яе ўзначальвае дацэнт Барыс Пятровіч Баркоўскі. За гэты перыяд выкладчыкамі кафедры выдадзена шмат артыкулаў, дапаможнікаў навукова-метадычнага плана, іншай літаратуры.

**З. АЛЯШКЕВІЧ,**
**наш кар.**

### IX РЭСПУБЛІКАНСКІ

навукова-метадычны семінар па НДРС прайшоў ва універсітэце. У ім удзельнічала больш за 400 выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ і тэхнікумаў. Заслухана каля 170 дакладаў аб вопыце і праблемах арганізацыі навукова-даследчай работы студэнтаў у Беларусі.

**А. НІКІЦЕНКА,**
**намеснік старшыні савета па НДРС.**



*Ганарова і адказна насіць званне радавога байца вялікай ленінскай партыі. Быць камуністам — гэта значыць усе свае сілы, веды і вопыт аддаваць справе служэння савецкаму народу, сацыялістычнай Радзіме.*

*Напярэдадні 60-гадовага юбілею СССР рады камуністаў універсітэта папоўніў новы атрад студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, якія сваёй вучобай, працай, грамадскай дзейнасцю пацвердзілі права быць членам КПСС.*

*НА ЗДЫМКУ: уручэнне партыйных дакументаў.*

Фота **В. Шачака.**

● ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

## Выдатнік. Актывіст. Ці перадавік гэта?

**«Быць на перадавой. Што гэта значыць!» — тэма размовы, якую прапанавала рэдакцыя газеты. І трэба сказаць, што, мяркуючы па водгуках, тэма балючая. Чытачы зноў і зноў выказваюць свае думкі, погляды, расказваюць пра перадавікоў, спрачаюцца.**

**Сёння на гэту тэму я папрасіла паразважаць студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна Галіну Курдзюк, Алу Ляховіч, Юрыя Смірнова, Ігара Зыбайлу.**

**Галіна КУРДЗЮК, студэнтка філалагічнага факультэта:**

— На маю думку, перадавая моладзь у нашы гады — гэта перш за ўсё тыя, хто працуе на камсамольскіх новабудоўлях, на асваенні цалінных зямель. Калі гаварыць іменна пра студэнтаў, то перадавікамі лічу ўсіх, хто добрасумленна працуе ў будатрадах і на ўборцы ўраджаю. Карацей, перадавікі там, дзе цяжэй, дзе больш за ўсё патрэбны іх маладосць і сіла.

**Ала ЛЯХОВІЧ, студэнтка механіка - матэматычнага факультэта:**

— Студэнт на перадавой — гэта перш за ўсё актывіст у грамадскай рабоце, той, хто выконвае яе так, каб другім было цікава вучыцца і адпачываць.

Я, як і кожны студэнт, таксама імкнуся быць на перадавой, жыць у нагу з часам: з'яўляюся адказнай за работу ваенна-патрыятычнага сектара ў групе. Работа падабаецца. Нядаўна, напрыклад, арганізавала экскурсію ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Многія былі тут упершыню. І ведаеце, як прыемна, калі бачыш, што твае намаганні прыносяць карысць іншым, радуюць тваіх таварышаў.

**Юрый СМІРНОЎ, студэнт факультэта журналістыкі:**

— Камсамолец на перадавой — гэта калі задаволены яго работай іншыя і калі ён сам, у справе і ў душы, адчувае сябе на вышыні. Не трэба для гэтага быць «круглым» выдатнікам ці «вялікім грамадскім дзеячам». Гэта нешта зусім іншае. Дапамагчы таварышу, добрасумленна выканаць даручаную справу, калі трэба, дасягнуць жаданага — вось пачатак перадавой. Рэгулярнае наведванне лекцый, семінараў, акуратныя канспекты, добрыя вынікі сесіі — гэта зусім не перадавая, гэта твае паўсядзённыя абавязкі, звычайнае студэнцкае жыццё.

**Ігар ЗЫБАЙЛА, студэнт факультэта журналістыкі:**

— Я таксама прытрымліваюся такой жа думкі. Хаця некаторыя спрабуюць запэўніць мяне ў адваротным: «Ты ж, — гавораць, — выдатнік, першы сярод нас». А мне здаецца, што мае выдатныя адзнакі ніякае не першынство. Проста я упэўнены, што чалавек заўсёды павінен працаваць з поўнай аддачай, таму што студэнт — гэта той жа рабочы на заводзе. Розніца толькі ў рабоце, якую яны выконваюць. А выконваць яе трэба заўсёды аднолькава добрасумленна.

А перадавікоў сярод нас шмат. Трэба толькі навучыцца бачыць іх.

**Запісала Л. КАМАІШКА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

РАБОТА ПА МЕСЦЫ ЖЫХАРСТВА

## ДАЙСЦІ ДА КОЖНАГА

АДБЫЎСЯ ПЛЕНУМ КАМІТЭТА камсамола, на якім разгледжаны задачы камсамольскай арганізацыі універсітэта па ўзмацненню ідэйна-выхаваўчай работы з камсамольцамі і моладдзю па месцы жыхарства. З дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола А. Рухля.

Ва універсітэце вучыцца 6885 іншагародніх студэнтаў, з іх у інтэрнатах жывуць 5352 чалавекі. У ліку лепшых сёння можна назваць інтэрнат № 6 (старшыня студсавета І. Святаха), № 7 (старшыня студсавета Г. Русіновіч).

На жаль, не ўсё яшчэ добра ў рабоце па месцы жыхарства. Калі мы навучымся прымаць «наша» за «сваё», калі не станем абыякава праходзіць міма выбітага шкла ці зламаных дзвярэй, толькі тады мы зможам з гонарам сказаць: «Інтэрнат — наш другі дом».

Работа камсамольскай арганізацыі універсітэта з моладдзю па месцы жыхарства ўключае дзейнасць педагагічных атрадаў, шэфскую дапамогу дзевяці сярэднім школам Мінска і сямі сельскім школам, ГПТВ і домакіраўніцтвам.

Пра работу, якая праводзіцца партыйным бюро, камітэтам камсамола, прафбюро ФПМ у інтэрнаце № 6, расказаў у сваім выступленні член камітэта камсамола ФПМ, намеснік каменданта інтэрната № 6 В. Гайдаш. Інструктар інтэраддзела камітэта камсамола універсітэта В. Арлоў спыніўся на праблемах работы з замежнымі студэнтамі ў інтэрнатах. Ён адзначыў сур'ёзныя недахопы ў рабоце камсамольскіх арганізацый факультэтаў і студсаветаў у гэтым напрамку.

У выступленні П. Лапцёнка, намесніка старшыні прафкома, былі пастаўлены задачы сумеснай ідэйна-выхаваўчай работы камітэта камсамола і прафкома БДУ імя У. І. Леніна ў інтэрнатах.

У прынятай пастанове адзначана, што камсамольскія арганізацыі факультэтаў прымаюць канкрэтныя меры, накіраваныя на паляпшэнне выхаваўчай работы з моладдзю па месцы жыхарства. Адобраны станоўчы вопыт работы ў гэтым напрамку камітэта камсамола ФПМ і студсавета інтэрната № 6, камітэта камсамола фізічнага факультэта і студсавета інтэрната № 2, камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта і студсавета інтэрната № 4.

Лепшымі па выніках года прызнаны камсамольскія педагагічныя атрады філалагічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў, факультэта прыкладной матэматыкі, радыёфізікі і электронікі, гістарычнага і фізічнага факультэтаў.

Пастановай прадугледжана далейшая актывізацыя палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах, павышэнне якасці мерапрыемстваў, расшырэнне сеткі гуртКоў у інтэрнатах і г. д.

**Ю. ВАРАТНІЦКІ,**
**кіраўнік прэс-цэнтра камітэта камсамола,**

**С. ШЫМАНСКАЯ,**
**член прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

## МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

**Для студэнта сесія — пара адказная, час надзей і трывог. Яна правярае нас на ўменне распараджацца набытымі ведамі, падводзіць вынікі вучобы ў семестры. Сёння думкамі аб надыходзячай сесіі дзеляцца замежныя навучэнцы — студэнты факультэта журналістыкі і фізічнага факультэта.**

# АДКАЗНАЯ ПАРА — СЕСІЯ

**НАДЗІР [Афганістан] — студэнт I курса факультэта журналістыкі:**

— Для мяне гэтая сесія — першая, а ўсё новае, як вядома, складана. Але я не адчуваю хвалявання, бо ведаю, што на дапамогу заўжды прыйдуць выкладчыкі, таварышы. Адчуваецца недастаткова добрае веданне рускай мовы, таму даводзіцца шмат працаваць.

**ЛЕМА ТАДЭСЕ [Эфіопія] — студэнт 3 курса факультэта журналістыкі:**

— Да сесіі патрэбна рыхтавацца загадзя. На трэцім курсе мы здаём два экзамены. Адзін з іх — «Асновы навуковай прапаганды». Газеты, часопісы, грамадска - палітычная літаратура — вось што складае прадмет падрыхтоўкі да экзамена. Калі сур'ёзна рыхтаваўся да семінарскіх заняткаў, не прапускаў лекцый, рэгулярна чытаў прэсу, тады ніякія цяжкасці не страшныя.

**ХАЛДЗІ НУР [Палясціна] — студэнт 4 курса факультэта журналістыкі:**

— А для мяне сесія — справа прывычная. Ужо неаднойчы даводзілася выпрабоўваць сябе: былі і поспехі, і няўдачы, і трывогі. Ды ведаю адно: толькі стараннасць і пастаянная праца над сабой дазваляюць паспяхова вытрымаць экзамен.

**ЭЛЬСЯ КАСЦІНЮ [Куба] — студэнтка 3 курса фізічнага факультэта:**

— Мне вельмі падабаецца час сесіі, калі ўсё залежыць ад самога сябе. Перад сесіяй я не хвалююся. Працую ў бібліятэцы, часта на дапамогу прыходзіць аднакурсніца Ірына Новік, тлумачыць незразумелыя тэмы, дапамагае рабіць канспекты.

**Пажадаем замежным студэнтам выдатна здаць залікі і экзамены, авалодаць трывалымі ведамі, каб у далейшым плённа працаваць у сябе на радзіме.**

**М. ДАХДУЛЬ,**
**студэнт 5 курса факультэта журналістыкі.**

# НАДЗЕЯ НЕ ПАМІРАЕ

ЁН СЯДЗЕЎ і ўспамінаў... Алі эль-Эйна. Палясцінец. Студэнт універсітэта. Мы не распытвалі яго ні аб чым. Ці да пытанняў чалавеку, які з болем углядаецца ў фатаграфіі загінуўшых бацькі і брата?

Пяць са сваіх дзевятнаццаці гадоў Алі змагаўся за зямлю, на якой нарадзіліся яго бацькі. У дзяцей Палясціны радзіму адняў вораг. І як жа трэба любіць яе, зямлю сваю, каб ужо з дзяцінства са зброяй у руках адстойваць права на бацькаўшчыну!

...Ён прыехаў да нас з Бейрута. І гэта больш чым сімвалічна, што шматпакутны народ пасылае сваіх сыноў і дачок да сяброў. Надзея не памірае, вера ў тое, што атрыманыя веды спатрэбяцца для будаўніцтва новага, мірнага будучага, — жыве ў людскіх сэрцах.

...Былы салдат спасцігае рускую мову. І расказвае. Пра баі. Пра смерць сяброў, гібель родных. І пра тое, што палясцінцы не здаліся. Павольна круціцца магнітафонная касета. Дзеці гавораць пра вайну: трывожна гудзе самалёт, паміж пранізлівым свістам снарадаў чуецца ціхі стогн параненага... І не трэба ведаць арабскую мову. Усё і так зразумела. Асабліва тое, што не гэта павінны бачыць дзіцячыя вочы.

Народ змагаецца — за жыццё, за перамогу. І галоўнае ў гэтай барацьбе — непахісная вера, сімвалам якой стаў 4-каляровы палясцінскі сцяг: зялёны — колер жыцця; чорны — памяць пра загінуўшых; белы — свабода; чырвоны — барацьба за яе.

**У. ХАРОШКА,**
**студэнт мехмата.**

# РАЗАМ З НАРОДАМ

**У Мінску разам з савецкімі людзьмі працуюць і вучацца тысячы замежных студэнтаў. Ёсць сярод іх невялікая, але дружная група моладзі з Грэцыі. Амаль усе гэтыя юнакі і дзяўчаты — камуністы. Якімі надзеямі жывуць яны, што іх клапоціць, аб чым мараць! Пра гэта — інтэрв'ю з Дзімітрысам Васілу, сакратаром арганізацыі камуністаў Грэцыі ў Мінску, студэнтам аддзялення палітэканоміі і будучым журналістам Ніколасам Бардуніасам.**

**Першае пытанне да Дзімітрыса Васілу:**

**— Дзімітрыс, ваша арганізацыя працуе далёка за межамі Грэцыі. Як падтрымлівае яна сувязь са сваёй краінай!**

— Мы бесперапынна сочым за падзеямі ў Грэцыі. У Маскве дзейнічае партыйнае бюро, якое звязана з ЦК партыі і Саюзам моладзі Грэцыі. Нам высылаюцца газеты: органы ЦК КПГ і Саюза моладзі. Такім чынам атрымліваецца, што мы ў курсе ўсіх падзей.

**— Не так даўно ў Грэцыі прайшлі выбары ў муніцыпалітэты, яны яшчэ раз пацвердзілі вялікую сілу Кампартыі ў вашай краіне. Чым абумоўлена такая папулярнасць камуністаў у народзе!**

— Паслядоўнасцю ў дзеяннях, сваёй сапраўднай народнасцю. Наша партыя абараняе інтарэсы простых людзей, змагаецца за іх правы.

**— І апошняе пытанне. Ці супрацоўнічае арганізацыя КПГ у Мінску з гарадскімі і партыйнымі камсамольскімі органамі!**

— У гэтым годзе мы заключылі дагавор аб супрацоўніцтве, праводзім таксама сумесныя канферэнцыі, сустрэчы з цікавымі людзьмі, разам працуем на суботніках. Такое супрацоўніцтва неабходна, яно — выражэнне імкнення нашых народаў да дружбы, узаемаразумення...

**Нашу размову працягвае Ніколас Бардуніас.**

**— Ніколас, вы амаль год займаецеся на факультэце журналістыкі і, вядома, сумуеце па радзіме!**

— Зразумела, сумую, хвалююся за яе лёс. Магчыма, і не вытрымаў бы доўгага развітання, але ў цяжкую хвіліну падтрымліваюць савецкія сябры. Савецкі Саюз стаў для мяне другой Радзімай. Тут я ўласнымі вачыма ўбачыў, што такое пралетарскі інтэрнацыяналізм у дзеянні, па-сапраўднаму зразумеў веліч сацыялістычнага грамадства.

**— Пройдуць гады, вы закончыце універсітэт, атрымаеце дыплом журналіста, вернецеся на радзіму. Якім уяўляецца вам далейшае жыццё ў Грэцыі!**

— Перш за ўсё — змаганне. За перамогу сацыялізму, за светлую будучыню, за шчасце майго народа. Як журналіст усе свае сілы я аддам у імя гэтай мэты.

**А. ЛІПСКІ,**
**Б. БАГДАНОВІЧ,**
**студэнты факультэта журналістыкі.**

## ШЭФСКІМ СУВЯЗЯМ — МАЦНЕЦЬ!

# УРОКІ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ

ЗДАРАЕЦЦА ТАКОЕ Ў ЖЫЦЦІ — ісціна, што ўяўлялася раней бясспрэчнай, прывычнай і крыху абстрактнай, прадстане раптам у іншым святле — і скранецца нешта ў душы ад пранізлівага разумення, ад пачуцця асабістага да яе дачынення. Мірнае неба над галавой... Большасць з нас бачыла яго толькі такім. Тыя ж, хто ведае, што бывае неба, якое нясе смерць і разбурэнні, не перастаюць напамінаць: «Людзі, будзьце пільныя!»

Навукова-тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР і 40-годдзю Сталінградскай бітвы, праведзеная супрацоўнікамі БДУ імя У. І. Леніна ў адной з падшэфных вайсковых часцей, яшчэ раз пацвердзіла — кожны з нас асабіста адказны за усё, што робіцца на зямлі. І няхай не здаецца гэта гучнымі словамі. Роднаснасць гэтых дат — 60-годдзя СССР і 40-годдзя Сталінградскай бітвы — заканамерная, яна прымушае ўспомніць аб тым, якой цаной, якімі намаганнямі, якой крывёю аплочана сённяшняя наша магчымасць урачыста адзначаць цудоўныя гэтыя святы.

Герой Савецкага Саюза, прафесар Д. П. Жмуроўскі ведае цану салдацкаму подзвігу. У яго выступленні на канферэнцыі асабліва выразна гучала думка аб узаемасувязі традыцый: свяшчэнны гераізм ваенных гадоў перадаў эстафету гераічнай працы дня сённяшняга.

Уважліва слухалі салдаты — прадстаўнікі пяцідзесяці нацыянальнасцей краіны — пра дасягненні братняй рэспублікі. І ведалі — у гэтых поспехах ёсць і частка іх працы. Дваццаць чатыры воіны часці маюць бацькоў-герояў, сыны — выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Такой спадчыннасцю ганарацца.

«Першы па подзвігах — век дваццаты». Быць вартым свайго часу, краіны, якая ўзрасціла і выхавала цябе, — што можа быць больш адказна?! Старшыня савета ветэранаў вайны, член партыйнага камітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт І. В. Марчанка расказаў аб гістарычным значэнні бітвы пад Сталінградам; іншыя выступаючыя падрабязна прааналізавалі той вопыт, якім узбагаціла славутая бітва ваенную навуку.

...Непрыкметна бег час, прыціхлыя, сядзелі воіны. Пра што думалі яны, як успрымалі выступленні старэйшых таварышаў?

Радавы Мікалай Клюка:

— Памятаю школьныя урокі і падручнік гісторыі з апісаннем Сталінградскай бітвы. Нас выклікалі, ставілі адзнакі. Мы ведалі і не ведалі даты, блыталі назвы, і пяцёрка за адказ уяўлялася вышэйшым шчасцем. Цяпер, калі крыху пасталеў, думаю: рознымі бываюць адзнакі, чагосьці можна і не запомніць, даражэй іншае — магчымасць адчуць, дакрануцца да гісторыі праз жывыя, шчырыя расказы ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай.

І яшчэ адзін юбілей змаглі б адзначыць удзельнікі канферэнцыі: 60 гадоў існуюць і развіваюцца шэфскія сувязі калектыву БДУ імя У. І. Леніна з воінамі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Рэгулярна праводзяцца сумесныя вечары, канферэнцыі, абмен канцэртамі мастацкай самадзейнасці. Вучоныя універсітэта прапагандуюць дасягненні навукі і тэхнікі.

...Канферэнцыя закончылася святочным канцэртам мастацкай самадзейнасці універсітэта. «Барыню» змяняла беларуская «полька», пасля «украінскага» танца пачынаўся «малдаўскі»... І не змаўкалі апладысменты. Яны перараслі ў сапраўдную авацыю, калі на сцэну выйшаў мастацкі кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок», заслужаны работнік культуры БССР М. В. Лапша. Васемнаццацігадовым гвардыі сяржантам прыняў ён свой першы бой пад Сталінградам, пазней вызваляў Румынію, Югаславію, Венгрыю, Польшчу, Балгарыю... Але жыла, гарэла ў сэрцы юнака любоў да танца, і не дзіўна, што калі дэмабілізаваўся, стаў ён удзельнікам ансамбля песні і танца Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі, а з 1967 года М. В. Лапша — кіраўнік калектыву мастацкай самадзейнасці універсітэта. ...Доўга не адпускалі байцы «крыжачкоўцаў», выхаванцаў Мікалая Вікенцьевіча, а трохкратнае салдацкае «дзякуй» стала самай лепшай падзякай усім арганізатарам шэфскай сустрэчы. Яны не забываюцца, гэтыя урокі дабрыні, мужнасці, грамадзянскасці...

**Н. КАЛІШЭВІЧ.**

## СТУДЭНТ І НТП

# ПЕРАМАГЧЫ — НЕ ГАЛОЎНАЕ

**У БДУ імя У. І. Леніна праходзіла першая Усесаюзная студэнцкая алімпіяда «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па праграміраванню. Для ўдзелу ў ёй у Мінск прыбылі каманды РСФСР, Украіны, Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Таджыкістана, Узбекістана, Кіргізіі, а таксама горада Масквы.**

**Каманду БССР прадстаўлялі лепшыя студэнты 3-5 курсаў факультэта прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна. Сярод іх Людміла Гамеза, Мікалай Дземеш, Іван Святуха, Галіна Пудлоўская і іншыя.**



З кожным днём у наша жыццё ўсё больш і больш уваходзіць электронная тэхніка. Ва ўсіх сферах дзейнасці, пачынаючы ад вырашэння важнейшых задач народнай гаспадаркі да работы ў даведачным тэлефонным бюро, на дапамогу чалавеку прыходзіць ЭВМ. Ужо даўно нікога не здзіўляе, што яна «навучылася» гаварыць, піша вершы і нават складае музыку.

«Чалавек павінен думаць, машына — працаваць» — гэтыя словы, якія сказаў адзін з удзельнікаў І Усесаюзнай алімпіяды па ЭВМ і праграміраванню, сталі дэвізам усіх студэнтаў-матэматыкаў, што на працягу чатырох дзён абаранялі права называцца самымі эрудзіраванымі, знаходлівымі, умелымі. Каля 70 прадстаўнікоў з розных тэхнічных ВНУ і універсітэтаў сталі ў гэтыя дні гасцямі БДУ.

Упартай, нялёгкай была барацьба ў чатырох турах алімпіяды. І да вялікай радасці мінчан першае месца заняла беларуская зборная. Акрамя таго, у асабістым заліку ўсе прызавыя месцы таксама прысуджаны нашым студэнтам. Права насіць чэмпіёнскі тытул заслужыў Мікалай Дземеш, студэнт III курса факультэта прыкладной матэматыкі. Сярэбраную і бронзавую ўзнагароды заваявалі Галіна Пудлоўская і Яўген Церахаў.

З Галяй Пудлоўскай, прызёрам спецыяльнага конкурсу па рашэнню задач на ЭВМ, нам давялося пагутарыць у дзень закрыцця алімпіяды. У руках — дыплом, на твары — радасная і ўрачыстая ўсмешка. Толькі крыху бянтэжаць яе дружныя віншаванні таварышаў.

— Як прайшла алімпіяда? Ці цяжка было?

— Ці цяжка? Не зусім. Для нас гэта справа прывычная. Баявы дух і здольнасці мы падтрымліваем на вышыні пастаянна. Матэматычныя «баі» паміж курсамі заўсёды прыбаўляюць нам новыя сілы. Але на алімпіядзе не толькі цяжка, а і цікава. На «машынным» туры, калі патрэбна было складаць праграму, выводзіць яе на ЭВМ і самім правяраць рашэнне, рабяты засядзеліся ў вылічальным цэнтры доўга, і нават думкі пра прыемны адпачынак у студэнцкім кафэ «Гаўдэамус» не змаглі адарваць іх ад работы. А потым былі сустрэчы з таварышамі, экскурсіі па Мінску, паходы ў кіно і тэатры беларускай сталіцы, паездка ў Хатынь.

І хай не ўсім пашанцавала, не ўсе рашэнні былі правільнымі, але нязменным застаецца дэвіз алімпіяды: перамагчы — не галоўнае, важна ўдзельнічаць.

**Э. ОЛІНА,**
**А. САЗАНОВІЧ,**
**студэнткі факультэта журналістыкі.**
Фота **аўтараў.**

# «Якое сэрца не адгукнецца...»

МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ ХВАЛЯВАЛА, як у час пазальнага захаплення эстраднымі рытмамі — на жаль, часта надта аднастайнымі — адстаяць прыгажосць і чысціню народнай песні? Адказ на гэта пытанне я знайшла, калі трапіла на рэпетыцыі універсітэцкага фальклорна - этнаграфічнага ансамбля «Неруш». Яго ўдзельнікі нічога не тлумачаць, не губляюць час у безвынікозых спрэчках. Яны проста пяюць. Не, нават не пяюць — «играют» песню. І гэта таксама адтуль — з глыбінь народных. Гэта цэлы абрад, маленькі і вельмі вобразны спектакль са своеасаблівым размеркаваннем роляў, сваёй «масоўкай», «галоўнымі героямі», сваімі, часта традыцыйнымі амплуа.

Скажаце, нам, нязвыклым да такога спосабу выканання, цяжка ўспрымаць тыя песні-гульні, што складаюць рэпертуар «Неруша»? Прыходзьце на іх канцэрты. Распытайце, як прымалі іх на гастролях. А ансамбль, дарэчы, паспяхова выступаў з канцэртамі па Мінскай вобласці, быў і на камсамольскіх будоўлях Свярдлоўскай, стаў дыпламантам конкурсу «Юнацтва камсамольскае маё...» Свярдлоўскага тэлебачання. Упэўнена, каментарыі будуць не патрэбны. Апладысменты ўдзячных слухачоў пераканаюць лепш, чым самыя хвалебныя водгукі мастацтвазнаўцаў.

Але і знатакі не стаяць у баку. Па запрашэнню студыі «Беларусьфільм» ансамбль запісаў некалькі песень для мастацкага фільма «Прымакі», здымаўся ў навагодняй перадачы Беларускага тэлебачання «Алеся», з вясной 1983 года «Неруш» будзе абараняць званне народнага калектыву.

...«Пераконваць трэба прыкладам. Знайсці, адрадзіць тое, што недаравальна губляецца ў паспешлівых буднях — вось наш абавязак перад будучыняй». Гэта крэда мастацкага кіраўніка ансамбля Валянціны Фёдараўны Гладкай. І ўсяго калектыву, таму што ў ім працуюць аднадумцы — народная песня патрабуе адзінства, уважлівых і беражлівых да сябе адносін і пошуку. Настойлівага. Цярплівага. Памятаеце, ехаў некалі адзін рамантык «за туманам і за запахам тайгі»? «Неруш» ездзіць за песнямі. Тлумачыць у вёсках, навошта яны нам, гарадскім, спатрэбіліся. І колькі потым метраў магнітафоннай плёнкі з каштоўнымі запісамі ўвозіць — не злічыць! А ў Мінску пачынаецца сапраўдная праца: ідзе калектыўная апрацоўка матэрыялу, спяваецца асобна кожны голас, і сучасныя будынкі са шкла і бетону напаўняюцца пахам лесу, вішнёвай квецені, непаўторнай шчырасцю сялянскага ранку. «Чапарушачку» змяняе «Зімня роса», а праз хвіліну ўжо чуецца: «Ой, ты, вішанька, ты, чарэшанька...» Чаго ў ёй толькі няма, у народнай песні: і нязлобны гумар, і «калючы» жарт, але над усім пануе адно — першародная чысціня. І якое сэрца не адгукнецца на яе!

**А. ЯФІМАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

Фота **В. Шачака.**



## ДА 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. М. ТАЛСТОГА

# Голас гісторыі, праўда гісторыі

10 СТУДЗЕНЯ 1983 ГОДА — знамянальная дата ў гісторыі савецкай культуры. Спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння выдатнага рускага пісьменніка Аляксея Мікалаевіча Талстога.

У такіх юбілеяў, акрамя магчымасці і патрэбы аддаць даніну павагі вядомаму дзеячу, ёсць яшчэ адна важная асаблівасць. Знамянальныя і важныя такія даты таму, што яны, магчыма, больш патрэбны нам, чым юбілярам — у нас паяўляецца магчымасць хоць крыху прыпыніцца і, азірнуўшыся на вялікае ў мінулым, падумаць пра важнае у сучасным, надзённым. Юбілеі ж — сведчанне сувязі часоў і пакаленняў, доказ неўміручасці ідэй і ідэалаў...

Безумоўна, у творчасці кожнага пісьменніка мы знаходзім тое, што адпавядае нашым густам, індывідуальным патрэбам. Але заўсёды стаіць перад намі пытанне аб сутнасці мастацтва, адметных рысах творчай асобы мастака і яго здабыткаў.

Талент Аляксея Мікалаевіча Талстога шматгранны, спадчына яго надзвычай багатая і разнастайная — гэта па заслугах ацанілі сучаснікі пісьменніка. Аднак, звяртаючыся да любога твора А. М. Талстога — ці гэта верш, ці нарыс, ці апавяданне, ці казка, ці аповесць, ці п'еса, ці раман, ці памфлет, — ніяк не абмінеш пытанні нацыянальнай гісторыі. І ці не гэта галоўнае, істотнае, прынамсі, з сучаснага пункту гледжання? Мне здаецца, у А. М. Талстога гісторыя заўсёды на першым плане, прычым гісторыя ў шырокім сэнсе — з усёй складанасцю яе развіцця, ва ўсёй супярэчлівасці вынікаў, у спрадвечнай барацьбе паміж дабром і злом, аптымізмам і адчаем.

Трэба аддаць належнае — А. М. Талстой пісаў гісторыю як таленавіты мастак і сапраўдны патрыёт. Як у выяўленні вытокаў нацыянальнай гісторыі, так і ў сцвярджэнні новага ён не староні рэгістратар і не каментатар фактаў, падзей. Заўсёды ён — неўтаймаваны мастак-даследчык, заклікаsuccessfully і мабілізаваны патрэбамі сваёй эпохі, мастак-філосаф, які не проста тлумачыць мінулае, але даследаваныя законы гісторыі імкнецца паставіць на службу пераўтварэння свету. Найбольш яскрава сведчаць пра гэта творы А. М. Талстога, напісаныя ў час Вялікай Айчыннай вайны, і асабліва публіцыстыка.

Калі паставіць пытанне, што ж цікавіла, прыцягвала выдатнага пісьменніка ў гісторыі, адказам на яго можа быць характарыстыка, якую даў А. Макаранка раману «Пётр І» — «жывы рух жывых людзей», інакш кажучы, людзі як творцы гісторыі. Ідучы за А. М. Талстым, мы разумеем, што гісторыю стваралі не толькі Іван Грозны ці Пётр І, што рухавіком гісторыі з'яўляецца дух народны, а праўда гісторыі — гэта вера ў неўміручасць народа, у магутнасць яго духу і розуму.

Няма патрэбы пералічваць заслугі А. М. Талстога ў стварэнні новай літаратуры, у культурным будаўніцтве і грамадска - палітычным жыцці Краіны Саветаў. Тут ён сам — гісторыя. Звернем увагу на другое: гэты пісьменнік на дзіва сучасны. У нашым жыцці, побач з намі А. М. Талстой як актыўны барацьбіт за мір. З нязменнай цікавасцю чытаюцца яго творы — ён разам з чытачамі ўсіх узростаў і нацый, рознага жыццёвага вопыту і густаў. Акрамя таго, з часам не перастае адчувацца прысутнасць творчых дасягненняў А. М. Талстога ў літаратурным працэсе нашых дзён. Бадай, не без яго ўплыву апошнім часам савецкая літаратура і публіцыстыка ўсё больш і больш засяроджваецца на ідэі і тэме «памяці» — памяці крыві і духу, памяці гістарычнай, нацыянальнай. Такім чынам, увага да гісторыі з'явілася перадумовай сучаснасці пісьменніка, паказчыкам значнасці яго творчых пошукаў.

Вядома, нельга забываць пра складанасць шляху А. М. Талстога. Ён памыляўся, сам «блукаў па пакутах» і пакутліва шукаў праўду гісторыі. А знайшоўшы, сумленна служыў ёй да канца сваіх дзён.

**І. ЧАРОТА,**
**выкладчык кафедры рускай савецкай літаратуры.**

Нядаўна народнаму паэту Беларусі, Герою Сацыялістычнай Працы, лаўрэату Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, старшыні Саюза пісьменнікаў БССР Максіму ТАНКУ (Яўгену Іванавічу СКУРКО) споўнілася 70 гадоў. На філалагічным факультэце адбылася сустрэча выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта з юбілярам.

# ШЧЫРАЕ СЛОВА ПАЭТА

## СУСТРЭЧЫ ДЛЯ ВАС

Студэнт II курса філфака У. СІЎЧЫКАЎ уключыў у інтэрв'ю і некаторыя пытанні, што былі зададзены паэту на сустрэчы.

**— Яўген Іванавіч, скажыце, калі ласка, што азначае Ваш псеўданім! З якой нагоды Вы ўзялі яго!**

— Калі Заходняя Беларусь была пад уладай панскай Польшчы, я не мог падпісваць творы сапраўдным прозвішчам і таму быў вымушаны хавацца пад псеўданімам. Чаму Максім? Гэта імя засталося ў мяне ад Максіма Горкага, я захапляўся яго творамі. Пазней даведаўся, што танк мае адносіны і да літаратуры: ёсць кароткая форма японскіх вершаў — танка.

**— Вы плённа працуеце творча, выконваеце шмат грамадскіх абавязкаў. Як вам удаецца ўсюды паспяваць! Як плануеце свой час!**

— Ніяк не планую. Проста раблю тое, што трэба рабіць у свой час, стараюся не адкладваць на другі дзень, бо ведаю, што, як гаворыць прымаўка, адклад не ідзе ў лад.

**— А якія якасці Вы найбольш цэніце ў чалавеку!**

— Добрасумленнасць, працавітасць... Але якасці можна пералічваць доўга, бо адна ці нават некалькі рыс не могуць запоўніць жыццё або ахарактарызаваць чалавека.

**— Як Вам бачыцца будучае беларускай літаратуры!**

— Адразу пасля вайны Саюз пісьменнікаў Беларусі налічваў 45 чалавек. Зараз жа ў яго ўваходзіць каля 350 членаў, і я вам магу сказаць, што на подступах да Саюза пісьменнікаў Беларусі мы бачым немалыя сілы. Гэта гаворыць пра тое, што будучыня кожнай нацыянальнай літаратуры — будучыня, на якую мы можам глядзець аптымістычна.

**— Як Вы ацэньваеце сучасны стан беларускай паэзіі! Каго Вы лічыце найбольш перспектыўным з маладых!**

— Я ўжо гаварыў, што стан сучаснай беларускай літаратуры не выклікае ніякіх сумненняў, што яна будзе развівацца, і аб гэтым гавораць і нашы часопісы і новыя творы, якія сістэматычна паяўляюцца і выдаюцца асобнымі выданнямі. Новыя літаратурныя сілы згуртоўваюцца каля розных літаратурных аб'яднанняў, газет, на прадпрыемсвтах, у ВНУ. Усё гэта, так сказаць, мацуе нашу веру ў будучае. Наша літаратура маладая, і моладзь грунтоўна падрыхтавана ў тэарэтычным плане. Застаецца пажадаць маладым, каб яны больш вывучалі жыццё, каб актыўней ўключаліся ў надзённыя нашы справы, бо без гэтага не можа быць пісьменніка. Калісьці ў літаратуру прыходзілі людзі, якія не ведалі, што такое ямб, харэй, але ў іх за плячыма былі гады падполля і грамадзянскай вайны, змагання за Савецкую ўладу. Але цяжка сказаць, што лепш: ці спачатку вучыцца, ці назапашваць жыццёвы вопыт. Кожны прыходзіць у літаратуру сваім шляхам.

Да пытання наконт перспектыўнасці маладых я б раіў падыходзіць асцярожна. Другі ці нават трэці зборнік з'яўляецца больш сур'ёзным экзаменам. У першай кнізе адбіваецца жыццё аўтара да яе выхаду, а вось наступная—паказчык духоўнага росту, сталення аўтара.

**— Вы згадалі ў «Литературной газете» пра «Знак бяды». Калі ласка, некалькі слоў пра аўтара.**

— Васіль Быкаў — адзін з выдатнейшых празаікаў, якія сказалі пра вайну, пра цяжкія гады і выпрабаванні, што перажыў народ. Яго творы сапраўды прагучалі ва ўсім свеце. У Быкава супала папулярнасць (у лепшым сэнсе гэтага слова) і глыбіня майстэрства, з якім ён узнімае глыбы псіхалагічных перажыванняў і паказвае іх па-мастацку пераканаўча.

**— Яўген Іванавіч, які ўплыў зрабіў на Вашу творчасць фальклор!**

— Бадай, з яго пачынаецца ўся беларуская літаратура. Гаварыць аб фальклоры — гаварыць аб сваёй маці, якая дала жыццё. Часам далёка адыдзеш у вершаваныя формы і прыходзіш быццам да нейкага тупіка. Тады заўсёды вяртаюся да першакрыніцы, якой з'яўляецца вусная народная творчасць.

**— А што найбольш запомнілася Вам у замежных камандзіроўках!**

Кожная з паездак не падобная да іншых. Не так даўно я прывёз цыкл вершаў пра Японію, ёсць у мяне і «амерыканскія» цыклы. Усё тое, што цікавіла і вабіла, я імкнуўся выказаць у вершах і дарожных замалёўках. Напрыклад, у Рыме ля партала храма Пятра і Паўла я ўбачыў маладых дзяўчат у манашаскім адзенні. Пашкадаваў прыгажуню, якая б магла жыць не ў цемры, а звычайным чалавечым жыццём. Атрымаўся верш не толькі аб каханні, аб прыгажосці жанчын, але і антырэлігійны.

**У канцы размовы Максім Танк звярнуўся да ўсіх чытачоў газеты «Беларускі універсітэт»:**

Жадаю студэнтам БДУ ім. У. І. Леніна выдатных поспехаў у вучобе, плёну на грамадскай ніве, выкладчыкам — добрых студэнтаў і шчасця ў асабістым жыцці.

Максім Танк

24. XII. 1982.

# ПЕРШЫЯ Ў ШАХМАТНЫМ МАРАФОНЕ

АМАЛЬ ДВА МЕСЯЦЫ працягвалася каманднае першынство Мінска паміж мацнейшымі калектывамі фізкультуры. Поспех у гэтых спаборніцтвах спадарожнічаў шахматыстам нашага універсітэта, якія занялі агульнае першае месца. Спартыўны гонар каманды абаранялі аспірант Г. Крылоў, студэнты Л. Смелы (фізфак), І. Мажэйка, А. Ягораў, Ю. Гельфанд (мехмат), І. Бабкоў (гістфак), Э. Калеснік (радыёфізічны факультэт) і дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў У. В. Амелькін.

Лепшых вынікаў дабіўся студэнт другога курса фізічнага факультэта Л. Смелы. Гуляючы на першай дошцы, ён не прайграў ніводнай партыі. У добрым стылі Л. Смелы перамог такіх моцных шахматыстаў, як В. Рыскін (БПІ), Ф. Ліўшыц (ДПЗ). Байцоўскі характар праявілі і іншыя ўдзельнікі спаборніцтваў. Вясной нашых шахматыстаў чакае сур'ёзнае выпрабаванне — першынство сярод ВНУ рэспублікі. Добра падрыхтавацца да яго — абавязак кожнага члена каманды.

**У. РЭЙЗІН,**
**дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту.**

# ДАСТОЙНЫЯ САПЕРНІКІ

З КОЖНЫМ ДНЁМ усё больш напружаны тэмп набіраюць спартыўныя спаборніцтвы па праграме XXXI спартакіяды. У снежні закончыліся гульні чэмпіяната БДУ імя У. І. Леніна па валейболу. Адзінаццаць каманд факультэтаў былі разбіты на дзве групы адпаведна месцам, якія былі заняты ў папярэднім першынстве.

У першай групе гулялі каманды фізічнага, механіка-матэматычнага, радыёфізічнага, гістарычнага, хімічнага і геаграфічнага факультэтаў, у другой — факультэта прыкладной матэматыкі, журналістыкі, біялагічнага, юрыдычнага і філалагічнага факультэтаў.

Вельмі цікавае становішча склалася ў першай групе. З-за дзвюх няявак на гульні каманды гістарычнага і хімічнага факультэтаў былі зняты са спаборніцтваў. «Парушальнікам спакою» з'явілася зборная геафака, каманда, якая толькі ў мінулым годзе змагла прабіцца ў рады мацнейшых і на якую ніхто сур'ёзна не звяртаў увагі. Добра гулялі студэнты геаграфічнага і да апошняга матча ні разу не зведалі паражэння. Усяго з адным пройгрышам прыйшла да апошняй гульні каманда фізічнага факультэта. Іменна ў паядынку паміж гэтымі камандамі вырашаўся лёс першага месца. Балельшчыкі, якіх, на жаль, было не вельмі многа, змаглі поўнасцю ўбачыць усю прыгажосць валейбола: і моцныя ўдары, і надзейны блок, і прыём «мёртвых» мячоў. Сапернікі былі дастойныя адзін аднаго, але ўсё ж майстэрства спартсменаў фізфака ўзяло верх. І ў гэтым няма нічога здзіўляючага: амаль усе ігракі каманды — члены зборнай БДУ па валейболу.

Хацелася б павіншаваць спартсменаў фізічнага факультэта з перамогай і пажадаць ім далейшых поспехаў у спорце і вучобе. Але нельга таксама не адзначыць добрую гульню студэнтаў геаграфічнага факультэта, якія ва ўпартай барацьбе занялі другое месца. Трэцяе месца ў каманды мехмата.

**І. ПРАКАПОВІЧ,**
**студэнт геаграфічнага факультэта.**



Спартакіяда набірае ход. Ужо названы мацнейшыя сярод валейбалістаў, баскетбалістаў, памераліся сілай барцы класічнага стылю і дзюдаісты... А наперадзе новыя старты, рэкорды і дасягненні. І няхай не кожны стане чэмпіёнам ці рэкардсменам — у выйгрышы здароўе.

Фота **В. Шачака.**

# КУЛІ ЛЯЦЯЦЬ УЦЭЛЬ

АДБЫЛОСЯ ПЕРШЫНСТВО па кулявой стральбе сярод першых курсаў. На працягу трох дзён у памяшканні універсітэцкага ціра грымелі стрэлы. Упэўненую перамогу атрымала каманда біялагічнага факультэта. На другім месцы — каманда геафака. Бронзавыя прызёры — студэнты журфака. Далей месцы размеркаваліся наступным чынам (у дужках сярэдні рэзультат):

| | | |
|---|---|---|
| 4. | Фізфак | (77,5) |
| 5. | Гістфак | (76,08) |
| 6. | Хімфак | (75.58) |
| 7. | Юрфак | (75) |
| 8. | ФПМ | (66,35) |
| 9. | Філфак | (64,67) |
| 10. | Радыёфізікі і электронікі | (54,33) |
| 11. | Мехмат | (43,11) |

Асабістае першае месца сярод юнакоў заняў студэнт біялагічнага факультэта Д. Ганчароў. Яго вынік — 96 ачкоў са 100 магчымых. На другім месцы Л. Сазон (ФПМ) — 91 ачко. Трэцяе месца з такім жа вынікам заняў студэнт геаграфічнага факультэта В. Малашкевіч.

У дзяўчат перамагла студэнтка гістфака В. Гардзейчык. Яна таксама набрала 96 ачкоў. Другое і трэцяе месцы занялі адпаведна І. Якубава (ФПМ) — 92 ачкі і Л. Міхеева (біяфак) — 92 ачкі.

Патрэбна адзначыць некаторыя арганізацыйныя моманты спаборніцтва. Па-першае, добра было арганізавана судзейства. Па-другое, звярніце ўвагу на вынікі радыёфізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. Як бачыце, разрыў вялікі не толькі з лідэрамі, але і з тымі, хто знаходзіцца ў сярэдзіне табліцы. Справа не ў тым, што географы ці журналісты лепш стралялі, справа ў дрэннай арганізацыі спартыўнай работы на факультэце. У выніку многія ўдзельнікі не з'явіліся.

Спаборніцтва было добрай трэніроўкай перад першынством БДУ імя У. І. Леніна па праграме спартакіяды, якая адбудзецца ў сакавіку.

**У. БЯЛОЎ,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

# ЗМЕНА ЧЭМПІЁНАЎ

НЕ ВЕДАЮ, што здарылася з жаночай камандай хімічнага факультэта па баскетболу. Чэмпіёнкі мінулага года страцілі свой тытул, ды яшчэ як! Адзін матч у першынстве універсітэта яны выйгралі, а потым... няўка.

— Дзяўчат строга папярэдзілі і дэканат, і спортбюро факультэта, — гаворыць старшыня спортбюро хімфака В. Анішчук. — Але... пасля такога і рукі апускаюцца.

І на чарговы матч каманда з'явілася не ў поўным саставе. І чэмпіёнкі выбылі з барацьбы. У наступным годзе такой моцнай камандзе прыйдзецца выступаць у слабейшай групе. Вось да чаго даводзіць безадказнасць.

Без хімфака ў дзяўчат не было роўных камандзе мехмата. У ёй гуляе некалькі членаў зборнай універсітэта. І яны даволі лёгка атрымлівалі перамогі над саперніцамі. З чацвёртага месца ў мінулым годзе мехмат перамясціўся на першае. Добры падбор ігракоў, някепская тэхніка, імкненне да перамогі — вось што характарызуе новых чэмпіёнаў. Баскетбалісткі ФПМ занялі другое месца, адцясніўшы каманду фізфака.

Многа ўвагі ўдзялялася камандзе факультэта журналістыкі, якая выступала пасля доўгага перапынку. За журфак гуляла член зборнай Савецкага Саюза па баскетболу, майстар спорту міжнароднага класа Галіна Савіцкая. Журналісткі даволі лёгка перамагалі, прычым апошнія матчы яны правялі без лідэра. Цяпер у журфака склалася някепская баскетбольная каманда, якая ў наступным годзе будзе змагацца за чэмпіёнскае званне. Выхад яе ў групу мацнейшых толькі зробіць барацьбу больш цікавай.

У хлопцаў за першае месца спрачаліся каманды юрфака, ФПМ, радыёфізікі і электронікі і гістфака. Усё рашаў матч паміж юрфакам і мінулагоднім пераможцам — ФПМ. Каманда ФПМ, аснову якой складаюць супрацоўнікі факультэта, смела пайшла ў атаку, бо толькі выйгрыш выводзіў яе на першае месца. Але юрысты, за якіх гуляў ігрок каманды РТІ Г. Каралёў, змаглі пераламаць ход сустрэчы і ў другім тайме поўнасцю авалодалі ініцыятывай. Яны перамаглі 70:53 і сталі чэмпіёнамі універсітэта. Другое месца за ФПМ, трэцяе заняў мехмат.

Трэба адзначыць, што розніца ў майстэрстве паміж камандамі была вялікая. У дзяўчат чатыры каманды — мехмата, фізфака, ФПМ і журфака — ярка выдзяляліся сярод астатніх. Геафак, хоць і выступаў у першай групе, але не склаў сур'ёзнай канкурэнцыі. А калі гаварыць аб другой групе, то можна ўспомніць цяжкія паражэнні біяфака, юрфака.

У мужчын някепскае ўражанне пакінулі амаль усе каманды першай групы, а таксама біяфак, факультэт радыёфізікі і электронікі. Што датычыць філфака, геафака і журфака, то яны змаглі разыграць месцы толькі паміж сабой.

**В. АНДРЫЕВІЧ.**

## ВІНШУЕМ

**ЗБОРНУЮ КАМАНДУ УНІВЕРСІТЭТА ПА ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫЦЫ, ЯКАЯ ЗАНЯЛА ДРУГОЕ МЕСЦА Ў ПЕРАДНАВАГОДНІХ СПАБОРНІЦТВАХ ПАМІЖ ВНУ г. МІНСКА.**

# ВОСТРАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

НА ПЕРШЫНСТВЕ універсітэта па валейболу сярод дзяўчат чэмпіёна доўга не маглі вызначыць. Справа ў тым, што каманды мехмата, ФПМ і хімфака заваявалі аднолькавую колькасць ачкоў. Розніца партый таксама аднолькавая. Тады пачалі падлічваць розніцу ачкоў у партыях. Лепшай яна была ў дзяўчат мехмата. На другім месцы — ФПМ, а мінулагоднія чэмпіёнкі — спартсменкі хімфака — на трэцім месцы.

Чацвёртымі былі валейбалісткі юрыдычнага факультэта, пятымі — біёлагі. Каманда фізічнага факультэта была знята са спаборніцтваў з-за няявак на гульні.

У другой групе перамогу атрымалі дзяўчаты факультэта журналістыкі, якія заваявалі пуцёўку ў групу мацнейшых.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**

**Прыводзім табліцу ходу спартакіяды. Супраць факультэтаў стаяць ачкі, якія ідуць у залік спартакіяды: б-б — баскетбол, в-в — валейбол, м — мужчыны, ж — жанчыны, б-к — барацьба класічная, д-д — дзю-до.**

| | б-б (м) | б-б (ж) | в-в (м) | в-в (ж) | б-к | д-д |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Юрфак | 180 | 60 | 30 | 90 | 184 | 184 |
| 2. Мехмат | 150 | 180 | 120 | 180 | — | 72 |
| 3. ФПМ | 120 | 150 | 70 | 150 | 88 | 9 |
| 4. Фізфак | 90 | 120 | 180 | — | 134 | 45 |
| 5. Гістфак | 80 | 50 | — | 60 | — | 90 |
| 6. Радыёфізікі і электронікі | 70 | — | 90 | 80 | 42 | 30 |
| 7. Геафак | 40 | 90 | 150 | 40 | 214 | 84 |
| 8. Хімфак | 60 | — | — | 120 | 80 | 79 |
| 9. Біяфак | 70 | 30 | 40 | 80 | — | 62 |
| 10. Журфак | 30 | 70 | 50 | 70 | — | — |
| 11. Філфак | 50 | 40 | 60 | 30 | — | — |



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
6 студзеня 1983 г.
Зак. 29. АТ 04006.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ